## *Актавая кніга полацкага магістарата 1650 г.: зборнік дакументаў*, выд. НАН Беларусі Інстытут гісторыі; склаў і падрыхтаваў да друку Максім Ю. Гардзееў, Мінск 2006, сс. 270, ілюстрацыі. Наклад 200 асобнікаў.

У мінулым годзе чарговы прыемны падарунак гісторыкам, якія вывучаюць Вялікае княства Літоўскае, зрабіў Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Ім была выдадзена *Актавая кніга Полацкага магістрата за 1650 г.*, падрыхтаваная Максімам Гардзеевым, таленавітым маладым беларускім даследчыкам, лёс якога склаўся вельмі трагічна. 24 ліпеня 2004 г. гэтая няўрымслівая, цікавая, поўная аптымізму і разнастайных арыгінальных планаў асоба, не маючы яшчэ 30 год, загінула. Максім Гардзееў быў першым у беларускай гістарычнай навуцы, які ўзяўся за абсалютна новую тэматыку, раней не даследаваную — вывучэнне комплексу крыніц, прысвечаных мінуламу беларускага горада. За падставу ўзяты актавыя кнігі Полацкага магістрата сярэдзіны — другой паловы XVII ст. Менавіта спецыфіка гарадскога жыцця ў Вялікім княстве Літоўскім з'яўляецца асаблівым адрозненнем нашай гісторыі ад суседніх. У параўнанні з расейскай гісторыяй гэта відавочна, бо на ўсход ад беларускіх абшараў гарадское жыццё не ўяўляла самастойнасці, не ведала прававых свабодаў у выглядзе магдэбургскага права, не стварыла ментальнасці мешчаніна, не адбілася ва ўласна гарадской культуры. У параўнанні з польскімі, чэшскімі альбо нямецкімі гарадамі ў беларускіхназіраюцца няскончанасць кшталтавання гарадской субкультуры. І тут прыходзіць у галаву цікавы метадалагічны прынцып, менавіта неразвітасць пэўных працэсаў, якія фіксуюцца на перыферыях, дазваляюць глыбей і адпаведней зразумець падобныя ў цэнтрах іх фармавання.

Наступная заўвага датычыць стану беларускай гістарыяграфіі па пытаннях гарадской праблематыкі. З ідэалагічных і палітычных меркаванняў у савецкі час, і нават у сённяшняй Беларусі, гісторыя сярэднявечча і новых часоў была не „папулярна”, бо папросту была забаронена. Дадзеная тэматыка знаходзілася пад пільным кантролем камуністычнай улады (сёння адміністрацыі прэзідэнта РБ) і доўгі час дазвалялася толькі вывучэнне сацыяльна-эканамічных ці сацыяльна-палітычных працэсаў у беларускіх гарадах. Пры гэтым абавязковая марксіцка-ленінская метадалогія, нават названыя цікавыя праблемы, прымушала разглядаць толькі праз святло канфліктаў беларускіх нізоў з польска-літоўска-жыдоўскімі вярхамі, праваслаўя з каталіцызмам, рамеснікаў са шляхтай. Да падобных можна аднесці працы Зіновія Ка-

пыскага, Анатоля Грыцкевіча, Уладзіміра Мялешкі, нават фрагменты тэкстаў Міхася Ткачова. Сітуацыя трохі змянілася ў 90-х гадах XX ст. Ігар Марзалюк звярнуўся да праблемаў ментальнасці гарадскога насельніцтва Магілёва[1], Максім Макараў даследаваў прававыя аспекты гарадскога жыцця Віцебска і Полацка[2], сацыятапаграфіі Гродна прысвяціў сваю кнігу Юра Гардзееў[3], шматлікія бакі гарадскога жыцця адлюстроўваліся ў адпаведных раздзелах дакуметальна-хранікальных кнігаў „Памяць".

Аднак найбольшай праблемай надалей застаецца крыніцазнаўчая база і метадалогія даследаванняў. Пераважна выкарыстоўваюцца шматлікія, друкаваныя яшчэ ў XIX ст. дакументы і пазітывізм як метадалогія. Значная колькасць архіўных крыніцаў заставалася па-за ўвагай альбо выкарыстоўвалася адзінкава. А казаць пра метады гістарычнай антрапалогіі ці гістарычнай псіхалогіі, функцыяналізм, структуралізм альбо постмадэрнізм у даследаваннях беларускіх гісторыкаў няма падставаў.

Пасмяротная публікацыя Максіма Гардзеева з'яўляецца адным з добрых сігналаў пра перамены ў беларускай гістарычнай навуцы. Ужо выдадзена 5 кнігаў *Літоўскай Метрыкі* XVI ст.[4], кодэкс лацінскіх дакументальных крыніцаў XIII — пачатку XIV стст., звязаных з першым вялікім князем літоўскім Міндаўгам[5]. Рэцэнзаваная кніга гэта высокаваліфікаваная археаграфічная і крыніцазнаўчая падрыхтоўка выдання дакументаў. Дадзеная публікацыя адпавядае ўсім сучасным патрабаванням выдання гістарычных крыніц. А гэта падвышае верагоднасьць і аўтэнтычнасць крыніцы і гарантуе больш абгрунтаваныя высновы.

1 І. Марзалюк, *Магілёў у XII-XVIII стст. Людзі і рэчы*, Мінск 1998.

2 М. Макараў, *Полацкі і Віцебскі земскія прывілеі. Да гісторыі стварэння тэкстаў дакументаў*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2003, nr 20, s. 5-32; ён жа, *Ад пасада да магдэбургіі. Юрыдычнае становішча насельніцтва гарадоў Беларускага Падзвіння ў XIV-XVI стст.*, Мінск 2005 (тэкст дысертацыі на атрыманне ступені кандыдата гістарычных навук).

3 J. Gordziejew, *Socjotopografia Grodna w XVIII wieku*, Toruń 2002.

4 *Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 28 (1522-1552 г.). Кніга запісаў 28*, падрыхтоўка тэкстаў да друку і навуковы апарат: В. С. Мянжынскі пры ўдзеле У. М. Свяжынскага, Мінск 2000; *Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 44 (1559-1566 г.). Кніга запісаў 44*, падрыхтаваў А. І. Груша, Мінск 2001; *Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 43 (1523-1560 г.). Кніга запісаў 43 (копія канца XVI ст)*, падрыхтаваў В. С. Мянжынскі, Мінск 2003; *Перапіс войска Вялікага Княства Літоўскага 1528 года: Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 523. Кніга публічных спраў 1*, падрыхтавалі А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч, Мінск 2003; *Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: Кніга 46 (1562-1565 г.). Кніга запісаў 46 (копія канца XVI ст.)*, падрыхтаваў В. С. Мянжынскі, Мінск 2006.

5 *Міндаў, кароль Літовіі, у дакумэнтах і сьведчаньнях = Mindowe, rex Lithowiae, in litteris et testimoniis*, НАН Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад., пер. на бел. мову, камэнт. А. Жлуткі, Мінск 2005.

Полацк заўсёды з’яўляецца сімвалічным горадам для беларускай мінуўшчыны і ментальнасці беларусаў. Аднак гісторыя гэтага горада не напісана (як і пераважнай большасьці гарадоў і мястэчак Беларусі). Сёння, дзякуючы працам археолагаў (Леанід Аляксееў, Георгі Штыхаў, Сяргей Тарасаў, Дзяніс Дук), мы ведаем пра матэрыяльную культуру насельнітцва, тапаграфію і архітэктуру Полацка X-XVIII стст. У пэўным сэнсе не з’яўляецца *tabula rasa* гісторыя Полацка XVI ст., дзякуючы даследаванням Васіля Вароніна і Андрэя Янушкевіча. А вось Полацак пасля катастрофы 60-70-х гадоў XVI ст. гэта вялікая таямніца, *terra incognita*. Ужо раней польскі гісторык праф. Станіслаў Александровіч зацеміў аб кардынальнай і радыкальнай змене насельнітцва і культуры горада. А напраўду мусім гаварыць аб дэградацыі калісьці слаўнага месца.

Ацалелыя пасля шматлікіх выпрабаванняў дакументы па гісторыі Полацкага магістрата захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску ў фондзе 1823 „Полацкі магістрат”, які ахоплівае 57 архіўных адзінак за 1650-1772 гг., сярод іх 50 актавых кніг — 6 з XVII ст. (1650 г., 1656-1657 гг., 1672 г., 1676 г., 1682 г., 1684 г.)[6], астатнія за XVIII ст.

Актавая кніга Полацкага магістрата за 1650 г. самая старая з захаваўшыхся, бо ранейшыя папросту недасягальныя для даследчыкаў. Нават яна, як вынікае з археаграфічнага апісання, некамплектная, дакументы ў ёй штучна сшытыя, таму часам пераблытаныя, частка з іх пашкоджаная. Яна на 259 аркушах (518 старонках) змяшчае загалоўкі 741 дакумента ва ўнутраным вопісе і тэксты 406 дакументаў па справах, якія разглядаліся з 1 студзеня па 29 снежня 1650 г. У прапанаваным чытачам выданні, падрыхтаваным Максімам Гардзеевым, надрукаваны ўнутраны вопіс і 248 дакуметаў. Не зразумелыя прычыны адсутнасці ў выданні яшчэ 158 дакументаў.

Выданне *Актавай кнігі Полацкага магістрата 1650 г.* забяспечана двума паказальнікамі (гэта падрабязны *Імянны паказальнік* і вельмі сціплы *Геаграфічны паказальнік*), а таксама шасцю цікавымі і грунтоўнымі дадаткамі. Дадатак 1: *Матэрыялы фондаў магістрацкіх кніг гарадоў Беларусі ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі да 1795 г.* Даследчыкі знойдуць у ім звесткі па 33 населеных пунктах — Ворша, Бабінавічы, Бабруйск, Бярэсьце, Віцебск, Ваўкавыск, Гарадок, Гарад-

[6] Згодна табліцы 2 у дадатку 2. Максім Гардзееў на падставе выпуску 1 выдання *Историко-юридические материалы, извлеченные из книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в центральном архиве в Витебске, и изданные под редакциею архивариуса сего архива Сазонова* (Витебск 1871) адзначае яшчэ 33 полацкія магістрацкія кнігі XVII ст., месцазнаходжанне ці існаванне якіх невядомыя. Самая старая кніга датавана 1633 г., самая маладая —1697 г.

ня, Дзісна, Дрыса, Друя, Жыровічы, Кобрынь, Крычаў, Лепель, Ліда, Менск, Мазыр, Магілёў, Нясвіж, Наваградак, Поразава, Пінск, Полацак, Пружаны, Ружаны, Рэчыца, Слуцк, Сураж, Ушачы, Чавусы, Чэрыкаў, Шклоў. З XVI ст. захавалася толькі 5 актавых кніг Магілёўскага магістрата, ды шэраг дакументаў з Брэсцкага. Ад наступнага XVII ст. у фондах НГАБ захавалася 51 актавая кніга з 8 беларускіх гарадоў (дадатак 1, табліца 1): 4 кнігі з Бярэсця, 3 з Гародні, 2 з Дзісны, 1 з Кобрына, 33 з Магілёва, 1 з Мінска, 6 з Полацка, 1 з Ружанаў.

Дадатак 3: *Спіс арыгінальных нумароў дакументаў, якія не ўвайшлі ў зборнік*. Вось дадзены спіс і выклікае пэўныя пытанні. А па якіх крытэрыях частка дакументаў засталася па-за межамі выдання? Чаму пераважная большасць не ўключаных у выданне дакументаў польскамоўныя? Некамплектнасць дадзенай архіўнай крыніцы пры выданні змяншае яе археаграфічную вартасць.

Цудоўным *vademecumat* для гісторыкаў, археолагаў і гісторыкаў архітэктуры Полацка з'яўляецца дадатак 4: *Тапаграфічныя апісанні аб'ектаў нерухомасці ў актавай кнізе Полацкага магістрата за 1650 г.* Дзякуючы падобнай інфармацыі маўклівыя рэшткі матэрыяльнай культуры, выяўленыя падчас археалагічных даследаванняў, змогуць загаварыць імёнамі сваіх даўніх уладальнікаў. З іншага боку гэта першасныя крыніцы дзеля канструявання сацыятапаграфічнай структуры Полацка на XVII ст., а магчыма і на папярэдняе.

У сітуацыі татальнай русіфікацыі значная частка беларускіх грамадзян не валодае і не выкарыстоўвае сучаснай беларускай мовы як сродка камунікацыі і штодзённага жыцця. Тым больш гэта адносіцца да праблемы знаёмства са старабеларускай мовай. На жаль, на гістарычных факультэтах беларускіх універсітэтаў не надаецца належнай увагі палеаграфіі і гісторыі мовы, не вывучаецца адпаведным чынам лацінская і польская мовы. А менавіта з сярэдзіны XVII ст. да пачатку XIX ст. пераважная болшасьць крыніцаў напісана па-польску, як значная колькасць дакументаў XIV-XVI стст. на лацінскай мове. А гэта ў сваю чаргу змяншае колькасць жадаючых займацца мінулым Беларусі сярэднявечнай і новага часу. Дзеля гэтага створаны дадатак 5: *Слоўнік малазразумелых слоў старабеларускай мовы*, у які ўключаны таксама і метралагічныя паняцці.

Апошні дадатак 6: *Узоры почыркаў кнігі* гэта 18 фотакопій з арыгінальных аркушаў Полацкай актавай кнігі 1650 г. Яны з'яўляюцца добрай крыніцай для палеографаў і дапаможным матэрыялам для навучання студэнтаў складанасцям і таямніцам старажытных дакументаў.

Аналізуючы змест надрукаваных у зборніку дакументаў здзіўляешся багаццю і разнастайнасці інфармацыі, якая ўтрымоўваецца ў іх тэкстах. І зноў цяжка не ўстрымацца ад эмацыянальнай рэфлексіі — ме-

навіта невыкарыстоўванне ў сваіх даследаваннях арыгінальных архіўных крыніцаў (нават тых, якія захоўваюцца на тэрыторыі Беларусі і не вымагаюць каштоўных і доўгатэрміновых выездаў за мяжу) моцна абмяжоўвала і збядняла тэматыку і змест гістарычных даследаванняў у савецкай і цяперашняй Беларусі. Напісаная часта на падставе друкаваных у XIX ст. суб'ектыўна падабраных дакументаў, пераважна па-расейску альбо перакладзеных на расейскую мову, гісторыя Беларусі перыядаў сярэднявечча і новага часу выглядае аднабокай, павярхоўнай і ў нечым непраўдзівай.

Увогуле дакументы, якія захоўваюцца ў актавых кнігах гарадоў з магдэбургскім правам, можна падзяліць на натарыяльныя (тэстаменты, дарэнні, куплі-продажы), гаспадарча-фінансавыя (інвентары, рэестры, рахункі, тарыфы), дзяржаўныя (прывілеі і універсалы, інструкцыі, пастановы), судовыя (выракі па справах, скаргі, позвы, інтрамісіі).

У першую чаргу дадзеная катэгорыя крыніцаў як *Актавая кніга Полацкага магістрата 1650 г.* высвятляе нам сацыяльную структуру горада. Мы даведваемся пра самаўрадаўцаў Полацка на 1650 г., якіх выбіралі ўсе маючыя права мяшчане. Гэта былі два бурмістры — адзін „рэлігіі рымскай", другі „рэлігіі рускай"; два райцы, таксама па аднаму прадстаўніку ад дзвюх веравызнанняў, і 6 лаўнікаў. Да гэтага далучаецца пасада гарадскога пісара. Вызначаюцца арандатары важніцы, вінніцы і цягельні, а таксама два шаферы, па аднаму на кожнае паўгоддзе (дакумент 1). Знаходзім мы інфармацыю аб механізмах выканання ўлады, прызначэннях і адмаўленнях ад пасадаў, тэрмінах кіравання (дакументы 3, 13, 77, 117, 161, 247).

Значная колькасць дакументаў паведамляе пра сацыяльны і прафесійны статус полацкіх мяшчанаў — гэта шаўцы, кавалі, слесары, краўцы, ткачы, ювелір, лекар, гарадскія рэзнікі. Натуральна, што ў еўрапейскіх гарадах, якія кіраваліся магдэбургскім правам, прафесійнае жыццё арганізоўвалася ў адпаведныя карпарацыі — „цэхі". Актавая кніга 1650 г. узгадавае ў Полацку цырульніцкі (дакумент 134) і кравецкі (дакументы 162, 163) цэхі. Таксама шмат інфармацыі ў магістрацкіх дакументах пра маёмасны стан полацкіх мяшчанаў. Значную частку іх цяжка было аднесці да „галоты", бо ўзгадваюцца залатыя і срэбныя рэчы, футры, зброя, шкляны і медны посуд. Мяшанай была і фінансавая сістэма. Разлікі і пазыкі рабіліся літоўскімі грошамі, польскімі злотымі, дукатамі, талерамі, лёвендаальдарамі.

Багацейшай крыніцай з'яўляюцца матэрыялы з *Актавай кнігі полацкага магістрата 1650 г.* для генеалагічных даследаванняў, а таксама антрапанімічных, урбанімічных і тапанімічных. А гэта дазваляе прасачыць рэлігійную структуру насельніцтва Полацка, бо імёны Аўдокія, Аўдоцця, Афанас, Васіль, Васка, Гаврыла, Грышка, Іван, Іля, Лявон,

Сямён, Сцяпан, Фёдар, Юрка і іншыя яўна маюць праваслаўнае паходжанне і іх носбіты належалі да „рускага” ці „грэцкага” веравызнання. З іншага боку Януш, Ян, Томаш, Стэфан, Марцін, Лукаш, Ёзаф, Войтех і іншыя гэта выразна каталіцкія імёны.

Знаходзім сярод дакументаў узгадку пра этнонім „Белая Русь”. 11 сакавіка 1650 г. шляхціч Браніслаў Прысецкі скрадзіўся на незаконны разгляд яго справы з архідыяканам Белай Русі, плябанам на Вядцу і Абольцах, ксяндзом Тэадорам Скуміновічам у полацкім гарадскім судзе (дакумент 168). Звяртае на сябе каталіцкі кантэкст ужывання этноніма Белая Русь у сярэдзіне XVII ст.

Шматлікія судовыя справы, якія разглядаліся полацкім гарадскім магістратам, дазваляюць прыадчыніць разнастайныя бакі штодзённага жыцця гараджанаў. Гэта пазыкі і разлікі, купаванні і продажы, гвалты, прымірэнні, крадзяжы, зладзействы, падманы. А з іншага боку эканамічная прагматычнасць і рацыяналізм, сямейныя ідыліі, абарона годнасці і культура.

На заканчэнне трэба адзначыць, што рукапіс да друку падрыхтаваў супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Алесь Доўнар. І яшчэ, чытаючы жывых сведкаў полацкага жыцця ў 1650 г. у галаву прыйшла дзіўная думка, што калі б кожны беларускі гісторык перыядаў сярэднявечча і новагу часу падрыхтаваў і выдаў нават па адной магістрацкай кнізе альбо павятовых земскіх і гродскіх судоў, а мясцовыя ўладныя структуры прафінансавалі дадзеныя ініцыятывы, дык нашая сучасная гістарычная памяць і свядомасць набыла б адпаведнай якасці і трываласці.

**Генадзь Семянчук**
(Гродна)